# ТУРЫСТЫЧНЫ МАРШРУТ
# “ЛЯ ВЫТОКАЎ ДУХОЎНАСЦІ”

**Слонім 2017**

Змест

Уводзіны…………………………………………………………………….......3

Асноўная частка. Апісанне турыстычнага маршруту……………………….5

Практычная частка…………………………………………..................12

Заключэнне……………………………………………………………………..13

Спіс выкарыстаных крыніц………………………………………………14

Дадаткі…………………………………………………………………………..15

## Уводзіны

Немагчыма ўявіць сабе культурнага і адукаванага чалавека, які б не ведаў гісторыі, звычаяў, мовы свайго народа. Але, на жаль, часта сустракаемся з тым, што маладыя людзі добра валодаюць некалькімі замежнымі мовамі, звесткамі аб падзеях з гісторыі іншых краін, а пра малую радзіму, месца, дзе нарадзіліся і жывуць самі, ведаюць няшмат.

Наша Беларусь – краіна даўняй і багатай праваслаўнай культуры. Сёння храмы вяртаюць сваю спрадвечную гістарычную і грамадскую сутнасць, становяцца сапраўднымі цэнтрамі духоўнасці і культуры, уздымаюць людзей над будзённасцю. Няхай не ўсе людзі шчыра вераць у Бога, не ўсе ходзяць у царкву, але і іх душа ўзбагачаецца, калі яны дакранаюцца да духоўных святынь.

Перадумовай для стварэння турыстычнага маршруту стала тое, што ў нас:

сабрана і абагульнена шмат матэрыялаў аб духоўных святынях сваёй мясцовасці;

даследаванні вучняў па тэме “Незабыўныя старонкі з гісторыі маёй вёскі” надрукаваны на старонках “Краязнаўчай газеты”;

сабраны этнаграфічны і краязнаўчы матэрыял быў пакладзены ў аснову афармлення экспазіцыі школьнага музейнага вугалка “Скарбы роднага краю”;

на базе школьный бібліятэкі працуе клуб “Родныя вытокі”, дзе настаяцель храма Раства Прасвятой Багародзіцы в.Міжэвічы а.Мікалай (Шчаюк) праводзіць Урокі духоўнасці для вучняў установы адукацыі.

Мэта нашай работы: паказаць ролю арганізацыі экскурсійнай дзейнасці па адраджэнні духоўнасці падрастаючага пакалення на прыкладах знаёмства са святынямі мясцовага рэгіёна.

Задачы:

вывучыць і прааналізаваць усе даступныя матэрыялы, якія дапамогуць даведацца аб мінулым і сучасным храмаў Слонімшчыны;

распрацаваць і арганізаваць пошукава-даследчыя мерапрыемствы;

далучыць як мага больш вучняў і дарослых да распрацоўкі і састаўлення турыстычнага маршруту;

выклікаць у падрастаючага пакалення цікавасць да вывучэння гісторыі і культуры роднага краю;

выхоўваць паважлівыя адносіны да духоўна-культурнай спадчыны.

Метады даследавання: краязнаўча-пошукавы, навукова-даследчы, практычны метад, сустрэчы са святарамі.

Аб’ект даследавання: духоўныя святыні Слонімшчыны.

Прадмет даследавання: арганізацыя экскурсійнай дзейнасці як сродак выхавання духоўнасці.

Гіпотэза: правядзенне работы па папулярызацыі духоўных святынь садзейнічае станаўленню маральных якасцей асобы.

## Асноўная частка. Апісанне турыстычнага маршруту

Мы пачынаем свой турыстычны маршрут “Ля вытокаў духоўнасці”, і цэнтральнае месца ў ім займае культурна-духоўная спадчына вёскі Міжэвічы. Прапанаваны намі маршрут пралягае праз населеныя пункты, якія мелі дастаткова важнае значэнне ў духоўным жыцці жыхароў навакольных вёсак. З Міжэвічамі яны звязаны тым, што ў часы адлучэння народа ад царквы храмы ў іншых вёсках былі закрыты, і іх прыхаджане наведвалі нашу царкву (Дадатак 1, 2). Храм у вёсцы Міжэвічы за ўсе гады свайго існавання не закрываўся ні разу.

Аб’ект 1. Царква Раства Прасвятой Багародзіцы в.Міжэвічы (Дадатак 3, фота 1).

Пры ўездзе з боку Слоніма ў вёску Міжэвічы на паўднёва-ўсходнім ускрайку гасцей сустракаюць дзве царквы: адна з іх – царква Раства Прасвятой Багародзіцы, якой у 2016 годзе споўніцца 152 гады, другая – у гонар іконы “Жываносная крыніца”, якой споўнілася 22 гады. У 2015 годзе храм адзначыў 220-годдзе з дня з’яўлення ў гэтых мясцінах іконы – невялічкай копіі на метале – Смаленскай Божай Маці. Мроіцца, што гэта быў нейкі знак, што наша зямля была невыпадкова абрана Маці Божай, што ўсе ліхалецці ўжо засталіся ў мінулым [2, с.3].

Падыходзім бліжэй і адчыняем браму. На тэрыторыі храма злева пад старым клёнам ляжыць вялікі камень (Дадатак 3, фота 2). Спыніцеся тут, прысядзьце, дакраніцеся далонню да каменя, патрымайце нейкі час і вы адчуеце цяпло.

З гэтым каменем звязана рэальная гісторыя ў жыцці настаяцеля Спаса-Праабражэнскага сабора г.Слоніма, ураджэнца в.Міжэвічы а.Віктара (Бакаўца). У дзяцінстве яму прысніўся сон, як Маці Божая, седзячы на гэтым камені, прадказала далейшы лёс хлопчыка. І прайшоўшы шляхам розных жыццёвых выпрабаванняў, Віктар стаў святаром, а пачынаў сваё служэнне менавіта тут, у Міжэвічах. Цяпер галоўнай справай жыцця а.Віктара з’яўляецца ўзвядзенне Дома-Прытчы на тэрыторыі Спаса-Праабражэнскага сабора.

Перад намі царква Раства Прасвятой Багародзіцы. Яна ўпамінаецца ў энцыклапедычным даведніку “Праваслаўныя храмы на Беларусі” як адзін з помнікаў царкоўнага дойлідства, якія ўвайшлі ў скарбніцу сусветнай архітэктуры. Будынак царквы – помнік народнага драўлянага дойлідства XIX стагоддзя (Дадатак 3, фота 1). Двухзрубная пабудова: прамавугольны ў плане асноўны аб’ём з трохграннай апсідай і прытвор з двух’яруснай чацверыковай званіцай, завершанай цыбулепадобнай галоўкай. Асноўны аб’ём накрыты двухсхільным дахам з вальмамі над апсідай. Фасады рытмічна падзелены слупамі-сцяжкамі, арачнымі аконнымі праёмамі ў простых ліштвах [3, с. 127].

Захавалася паданне мясцовых жыхароў аб іконе Смаленскай Божай Маці, якая з’уляецца асноўным сімвалам храма (Дадатак 4). “На гэтым жа самым месцы, дзе стаяла старая царква і дзе стаіць цяпер новая, калісьці была паходная царква 80-га пяхотнага палка Расійскай імперыі часоў Екацярынінскіх. Асноўным сімвалам царквы была копія на метале іконы Смаленскай Божай Маці, якую воіны шанавалі як цудадзейную. Гэты полк стаяў тут лагерам і праз нейкі час збіраўся ў дарогу. Калі ікона і паходная цэркаўка былі пакладзены ў павозку, то запрэжаныя ў яе коні не змаглі крануцца з месца. Нарэшце воіны зразумелі, што тое быў знак, што Маці Божая абірала тут, у гэтай вёсцы, яшчэ адзін для сябе прытулак. Магчыма, глыбокая, шчырая вера тутэйшых жыхароў стала адной з прычын таго, што Маці Божая праз маленькую копію іконы хацела падтрымаць людзей, адвесці навалы і ліхалецці, якія неаднаразова здараліся з людзьмі”. Так копія іконы засталася ў вёсцы і з гэтага часу пачынаецца гісторыя нашага храма.

Месцам яе ўсталявання стаў вялікі драўляны крыж, які размясцілі на месцы, дзе стаяў прастол паходнай царквы. У 1800 годзе на сабраныя сялянамі грошы была пабудавана і асвечана царква [1, с.38].

Людзі былі перакананы, што цудадзейны абраз быў пасланы для пазбаўлення іх ад розных наступстваў, бо, пакуль яго не было, часта наведваліся голад, пажары, хваробы у людзей і свойскай жывёлы. З гэтага часу

ў вёсцы не было ніводнага пажару і, акрамя халеры ў 1855 годзе (такая была паўсюдна), ні адной павальнай хваробы ні на людзях, ні на свойскай жывёле не было. У 1864 годзе на сродкі, сабраныя сялянамі вёскі Міжэвічы, быў пабудаваны храм, які мы бачым зараз.

Перад царквой пастаўлена драўляная двух'ярусная брама-званіца каркаснай канструкцыі. Агульныя дэталі дэкору (арачныя праёмы, шалёўка сцен) аб'ядноўваюць яе з царквой у адзіны архітэктурны ансамбль [3, с.128].

Пры ўваходзе ў храм адразу ж звяртаем ўвагу на мастацка-дэкаратыўнае афармленне іканастаса. Царскія вароты з'яўляюцца яскравым узорам тэхнікі разьбянога мастацтва.

У царкве ўтрымліваюцца іконы з моманту яе пабудовы і прывезены яны былі з Расіі. Пісаў іх вучань Сымона Ушакова – Дзмітрый Цітоў. Вядома, што іканапісец працаваў з 1682 па 1703 год. Гэта дае магчымасць меркаваць, што ў царкве знаходзяцца спісы ікон, якія былі створаны ў канцы XVII – пачатку XVIII стст. Яны напісаны на палотнах маслам, вельмі шануюцца вернікамі і з'яўляюцца сапраўднай культурна-гістарычнай каштоўнасцю.

Побач з царквой Раства Прасвятой Багародзіцы знаходзіцца яшчэ адзін храм. У 1993 годзе па ініцыятыве а.Віктара (Бакаўца) пачалося будаўніцтва царквы на тым месцы, дзе калісьці непадалёку была крыніца з празрыстай, сцюдзёнай вадой. У 1994 годзе храм "Жываносная крыніца" прыняў сваіх першых вернікаў.

Наступным пунктам нашага маршруту будзе царква мучаніцы Параскевы в.Старыя Дзявяткавічы. Едзем па насыпной дарозе. Адлегласць 13 км. Па ходу маршруту расказваем легенду пра вёску Дзявяткавічы.

Легенда пра Дзявяткавічы

У бацькі было 9 сыноў. Ішоў час, і сыны сталі дарослымі. Першым ажаніўся старэйшы сын. Нарадзіліся дзеці. Стала цесна ў невялікай хаце. Вось і кажа бацька старэйшаму сыну: "Выбірай, сынок, зручнае месца. Будзем табе

новую хату будаваць”. Хлопец выбраў зручнае месца для пасялення, а бацька з братамі дапамагалі пабудаваць хату.

Потым ажаніліся іншыя браты. Адзін за адным, услед за старэйшым братам, будавалі сабе хаты. Хутка ўзнікла вёска з дзевяці двароў. Вось і вырашылі браты назваць сваю вёску Дзявяткавічы [5, с.353].

Аб’ект 2. Царква мучаніцы Параскевы в.Старыя Дзявяткавічы (Дадатак 5).

Храм Святой мучаніцы Параскевы адзін са старажытнейшых храмаў на нашых мясцінах [3, с. 142]. Ён быў узведзены ў 1675 годзе. У гэтым жа годзе царква была надзелена зямлёй. Хоць ёсць звесткі, што першае ўпамінанне адносіцца да 1620 года, калі памешчыца Марыя Багданаўна Мялешка надзяліла царкву “Пятніца Святое” зямлёй, якую апрацоўвалі дзве сялянскія сям’і. У 1779 годзе быў пабудаваны новы храм на каменным фундаменце.

Сучасная царква пабудавана ў 1820 годзе з дрэва на сродкі ўладальніка памесця Дзявяткавічы памешчыка Войцаха Пуслоўскага.

Настаяцелем храма з 1940 года быў святар Фёдар Кашэня. У часы нямецкай акупацыі ён абараняў мясцовае насельніцтва ад варожага насілля, выратаваў ад смерці сотні людзей і ўвогуле вёску. Нягледзечы на пагрозы фашыстаў, быў сувязным партызанскага руху. За дзесяць гадоў свайго пастырскага служэння падняў рэлігійны дух прыхода на пэўную вышыню. Увесь час падтрымліваў струхнелыя сцены царквы.

У 1964 годзе храм быў закрыты. Богаслужэнні ўзнавіліся ў 1989 годзе [1, с. 43].

Працягваем наш маршрут. Наступны аб’ект – Свята-Міхайлаўская царква ў в.Старая Перавалока. Адлегласць 13 км па насыпной дарозе. Расказваем легенду пра вёску Махначы, якая сустракаецца на нашым шляху.

Легенда пра Махначы

Вясковыя людзі пра Махначы распавядаюць страшную легенду. Нібыта на месцы, дзе зараз знаходзіцца вёска, рос густы лес. І ў гэтым лесе жыў адзін

чалавек. Быў ён вельмі камлатым, кудлатым і кашлатым. Людзі называлі яго па-мясцоваму – махнаты. Усе баяліся махнатага чалавека, але ў лес па ягады і грыбы ўсё роўна хадзілі. А пра таго, хто ў лесе заблудзіўся і дамоў не вярнуўся, казалі, што схапіў яго махнаты. За многія гады нахапаў махнаты шмат люду. Дамоў ён нікога не адпускаў, таму людзі жылі ў лесе, дзе будавалі сабе жыллё. А калі махнаты памёр і людзі сталі вольнымі, сваё паселішча яны назвалі Махначы [5, с.359].

Аб’ект 3. Свята-Міхайлаўская царква в.Старая Перавалока (Дадатак 6).

Перад намі Свята-Міхайлаўская царква, якая была пабудавана ў 1559 годзе ў гонар Святога Архангела Міхаіла на сродкі польскіх князёў Сапегаў. Гэта самы старажытны храм на Слонімшчыне.

Перавалоцкі прыход атрымаў назву ад слова “валакаць”. Паводле падання, мясцовасць гэта пуставала, і па прапанове князя Сапегі (імя невядома) сяляне з іншых мясцовасцей пачалі пераходзіць (перавалакаць, гэта значыць нешта за сабою валачыць) са сваім скарбам і засяляць пустуючую мясцовасць. Для іх хутка і была пабудавана царква. Пры ўваходзе ў панамарку ляжыць вялікі пляскаты камень, на якім па-польску напісана “1600 roku”. Мяркуюць, што ў гэтым годзе прыход перайшоў у унію.

Жыхары навакольных вёсак празвалі сялян Перавалоцкага прыхода “гайдунамі”. Гэта назва паходзіць ад слова “гайдук”. Магчыма, продкі гайдуноў служылі гайдукамі ў уладальніка, а па мясцовым паданні – у караля. У гайдуноў было сваё народнае свята “Гойды”, якое адзначалася ў верасні. Перавалоцкая царква заўсёды была багата ўпрыгожана і шчыра наведвалася прыхаджанамі ў нядзелю і святочныя дні.

Прыход славіўся шматлюдным наведваннем богаслужэнняў. У ім налічвалася 3500 прыхаджан. Храм перабудоўваўся ў 1740 годзе: па ўніяцкай задуме царкву разабралі па бервяне і павярнулі на захад, алтар таксама быў павернуты на захад, як прызнак вяршынства Папы Рымскага. У такім выглядзе алтар захаваўся і да нашых дзён.

У часы Вялікай Айчыннай вайны храм не закрываўся, настаяцелем быў святар Віталій Бабіч. У часы вайны а.Віталій ратаваў сваіх прыхаджан тым, што выдаваў ім даведкі, у сваім родзе пашпарты, і тых, у каго былі такія даведкі, немцы нікуды не вывозілі.

Шматгадовае служэнне настаяцелем прыходу а.Віталія Бабіча з вышэйшай багаслоўскай адукацыяй стварыла вялікую славу гэтаму прыходу ва ўсёй епархіі.

У храме ёсць старыя іконы, якія былі падараваны прыхаджанамі ў 1874 годзе.

У гэтым храме ні ў якія часы не спынялася царкоўнае жыццё. [1, с. 49].

Недалёка ад Переваловцкага храма працякае крынічка і, па словах настаяцеля а.Леаніда (Барбажынскага), у архіўных звестках яна ўпамінаецца як Крынічка Іарданка.

А цяпер па шашы едзем у в.Пасінічы. Адлегласць 14 км. Так як будзем ехаць праз Міжэвічы, можна расказаць легенду пра вёску.

Легенда пра Міжэвічы

З даўніх часоў паміж Ружанамі і Слонімам знаходзіўся гасцінец, па якім на фурманках дабіраліся людзі з аднаго месца ў другое. На сярэдзіне шляху, каля ракі, яны звычайна рабілі прыпынак (“між”, “паміж”). Так з’явіліся першыя хаткі, з якіх паступова вырасла невялікая вёсачка, якой вельмі падыходзіла назва “Міжэвічы”.

Аб’ект 4. Свята-Георгіеўская царква в.Пасінічы (Дадатак 7).

Свята-Георгіеўская царква ўзведзена на мясцовых могілках у 1863 годзе ў гонар Святога вялікамучаніка Георгія Пераможцы на ахвяраванні сялян. У храме зроблены прыгожы іканастас, царскія вароты разьбяной работы ў пазалоце, іконы ў пазалочаных рамках, пісаны ў Маскве. Жыхары вёскі Пасінічы на пабудову царквы ахвяравалі 1000 рублёў, 155 бярвенняў, 50 дошак і 947 працоўных дзён сваёй працы. Плошча храма 63 м. кв. Ёсць тры невялікія званы, яны звоняць перад кожным набажэнствам.

У 1961 годзе царква была закрыта. Старыя людзі ўспамінаюць, што ў той дзень, калі з раёна прыехалі закрываць царкву, народ быў вельмі ўсхваляваны. Жыхары сабраліся каля храма, плакалі дарослыя і дзеці. Адзін з мужчын палез наверх, хацеў звярнуць крыж, але той не паддаваўся. Мясцовым жыхарам сказалі разабраць іконы па хатах, але ніхто не паслухаўся. Дасведчыя людзі іх раней папярэдзілі, што калі яны разбяруць іконы па хатах, гэта будзе азначаць, што царква закрыта па просьбе жыхароў. Частка ікон была вывезена ў Міжэвічы. Старшыні калгаса загадалі ў храме зрабіць калгасны склад. Ён закрыў храм на замок, але склад там не зрабіў.

Да канца 80-х гадоў царква знаходзілася ў паўразбураным стане і была ўзноўлена і асвечана ў 1988 – 1989 гг. [1, с. 32].

Апошнім пунктам нашага маршруту будзе Свята-Ільінская царква ў в.Сурынка. Адлегласць 12 км па шашы і насыпной дарозе. Паслухаем легенду пра пана Сурына.

Легенда пра пана Сурына

Гісторыя пра пана Сурына адбылася вельмі даўно. Людзі толькі пачалі асвойваць новую мясцовасць, будаваць хаты. Уся гэта зямля належала пану Сурыну. Ён цэлымі днямі гуляў з панамі-суседзямі ў карты. Аднойчы вясной, калі было вялікае разводдзе, каб заехаць да сваіх паноў-сяброў Сурын, загадаў пабудаваць мост. Мясцовыя мужыкі прасілі пана не будаваць мост, бо на гэта няма часу, трэба было рыхтавацца да пасяўной. Але той не пагадзіўся. Больш за ўсё пана прасіў селянін Дзям’ян, за што яго забілі розгамі. І тады Дзям’янавы сыны вырашылі адпомсціць пану за бацьку. Цёмнай ноччу, калі Сурын вяртаўся ў брычцы з гулянкі, браты спынілі яго на мосце і закалолі віламі.

Прайшло шмат гадоў. Новая вёска была пабудавана недалёка ад моста, які людзі называлі Сурынаў мост. Таму і вёску назвалі Сурынкай [5, с. 361].

Аб’ект 5. Свята-Ільінская царква в.Сурынка (Дадатак 8).

Свята-Ільінская царква пабудавана ў 1862 годзе на месцы капліцы ў гонар прарока Іллі [3, с. 117]. У 1854 годзе ў некаторых месцах Слонімскага ўезда

быў вялікі падзеж свойскай жывёлы. Гэта бяда закранула і в.Сурынка. Каб прадухіліць вёску ад страшнай напасці, мясцовы селянін І.Янушэвіч прапанаваў сялянам пабудаваць у канцы вёскі часоўню і драўляны крыж – сродкі супраць ворагаў бачных і нябачных.

І.Янушэвіч быў вельмі рэлігійным чалавекам. Сярод аднавяскоўцаў карыстаўся вялікай павагай, і яго слова для ўсіх было свята.

Галоўным майстрам вырашылі паставіць самога ініцыятара І.Янушэвіча. Ён спачатку адмовіўся, бо баяўся, што не справіцца з богаўгоднай справай так, як трэба. Але ноччу яму прысніўся старац з кіёчкам у руцэ, які паграджаў за адмову ўзначаліць пабудову часоўні. На другі дзень І Янушэвіча зноў прыйшлі запрашаць узначаліць будаўніцтва. Ён расказаў аднавяскоўцам свой сон і з ахвотай пагадзіўся. Пасля таго, як часоўню пабудавалі і асвяцілі, падзеж свойскай жывёлы спыніўся.

Часоўня праіснавала да 1862 года, потым была пабудавана царква ў гонар прарока Іллі.

Царква была невялікая, на каменным фундаменце, пакрытая гонтам. Пабудова абышлася сурынскім сялянам у 2000 рублёў срэбрам, так як лес прывозілі за 40 вёрст ад сваёй вёскі.

Вельмі цікава ў Літоўскіх Епархіяльных Ведамасцях апісваецца прычына пабудовы царквы на месцы часоўні. Прычына ўся ў тым, што праз некалькі гадоў пасля пабудовы часоўні І.Янушэвічу ў сне з’явіўся Сам Спасіцель і паведаў яму аб тым, што ў часоўні вельмі цесна. І.Янушэвіч расказаў свой сон аднавяскоўцам, і яны з ахвотай пагадзіліся будаваць царкву, паабяцалі дапамагаць і грашыма, і працай. За два месяцы царква была ўзведзена і асвечана. І.Янушэвіча аднадушна выбралі старастам. Вясною 1864 года была ўстаноўлена агароджа, а пазней пабудавалі званіцу з трыма званамі.

У 1867 годзе царква была расшырана, так як не змяшчала ўсіх вернікаў.

У часы хрушчоўскіх ганенняў у 1961 годзе царкву знялі з дзяржаўнага ўліку і закрылі. Рабіліся спробы зрабіць там склад, але ж мясцовы люд днём і

ноччу ахоўваў сваю святыню. У 1988 годзе тут узнавіліся богаслужэнні. У 1995 годзе была пабудавана новая званіца і хрысцільня з цэглы.

У Сурынцы знаходзіцца самы стары звон у Беларусі, ён датуецца 1702 годам [4, с. 48] (Дадатак 9).

У Слонім вяртаемся па Косаўскім тракце праз вёску Дзеравянчыцы.

Практычная частка

Мэтавая аудыторыя турыстычнага маршруту: рознаўзроставая (школьнікі, студэнты, дарослыя).

Час праходжання маршруту:  4 гадзіны.

Працягласць маршруту ў км: 71, 5 км.

Від  маршруту: аўтамабільны (магчымы веласіпедны, пешы ход).

Небяспечнасць маршруту: стан дарог па нітцы маршруту добры: дарогі насыпныя і з цвёрдым пакрыццём, па трасе рух невялікі, небяспекі для жыцця і здароўя дарогі не ўяўляюць.

Прыблізны разлік маршруту: экскурсія на аўтобусе на 25 чалавек –

100 рублёў (4 рублі на 1 чалавека); экскурсія на мікрааўтобусе на 14 чалавек – 80 рублёў (5 рублёў 80 капеек на 1 чалавека).

## Заключэнне

У ходзе даследавання была вывучана і прааналізавана літаратура аб мінулым і сучасным храмаў Слонімшчыны, адбыліся сустрэчы з мясцовымі краязнаўцамі, настаяцелямі наведаных храмаў.

Экскурсія, арганізаваная для навучэнцаў нашай установы адукацыі па складзеным маршруце, садзейнічала прывіццю любові да Радзімы, цікавасці да вывучэння духоўна-культурнай спадчыны беларускага народа, спрыяла выхаванню пачуцця калектывізму, узаемадапамогі, развіццю камунікатыўных навыкаў падрастаючага пакалення.

Спадзяёмся, што вандроўка па прапанаваным намі маршруце нікога не пакіне абыякавым і раўнадушным, бо наведванне святынь заўсёды ўзбагачае духоўна.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Барбажинский, Л.А. Историко-статистическое описание приходов Слонимского благочиния Новогрудской епархии. / Л.А.Барбажинский. – Жировичи, 2008. – 56 с.

2. Зинченко, И.Н. В Мижевичах – храмовый праздник / И.Н. Зинченко // Слонімскі веснік. – 2014. – №51-52

3. Кулагін, А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі / А.М.Кулагін. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2001. – 267 с.

4. Кулажанка, Л.Я. Праваслаўныя святыні на Беларусі: дапаможнік для настаўнікаў гісторыі і выкладчыкаў курса рэлігіязнаўства / Л.Я. Кулажанка. – Мінск: Беларуская навука, 2005. – 244 с.

5. Чыгрын, С.М. Слонім і ваколіца: гісторыка-краязнаўчыя і літаратуразнаўчыя артыкулы, гутаркі / С.М. Чыгрын. – Мінск: Кнігазбор, 2014. – 376 с.

## Дадаткі

Дадатак 1

### Нітка маршруту

Маштаб: 1: 1 00 000

У адным сантыметры  1 км

Умоўныя абазначэнні

Асноўны маршрут

Зваротны маршрут

1. Царква  Раства Прасвятой Багародзіцы в.Міжэвічы

2. Царква мучаніцы Параскевы в. Старыя Дзявяткавічы

3. Свята-Міхайлаўская царква в.Старая Перавалока

4. Свята-Георгіеўская царква в.Пасінічы

5. Свята-Ільінская царква в.Сурынка

Слонім – Міжэвічы – 20 км

Міжэвічы – Старыя Дзявяткавічы – 13 км

Старыя Дзявяткавічы – Старая Перавалока – 13 км

Старая Перавалока – Пасінічы – 14 км

Пасінічы – Сурынка – 12 км

Сурынка – Слонім (па Косаўскаму тракту) – 11,5 км

Агульная працягласць маршруту – 71,5 км

Дадатак 2



Дадатак 3



1. Царква Раства Прасвятой Багародзіцы в.Міжэвічы



2. Цудадзейны камень каля царквы Раства Прасвятой Багародзіцы

Дадатак 4





Ікона Смаленскай Божай Маці

Дадатак 5





Царква мучаніцы Параскевы в.Старыя Дзявяткавічы

Дадатак 6






Свята-Міхайлаўская царква в.Старая Peравалока

Дадатак 7





Свята-Георгіеўская царква в.Пасінічы



Свята-Ільінская царква в.Сурынка





Дадатак 9





Самы старажытны звон на Беларусі